ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (1235) ● 15 сакавіка 1979 г.

Цана 2 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ: АКТЫВІСТЫ МАЛАДЗЁЖНАГА РУХУ ПНР У БДУ ● ЗЛЁТ ВЫДАТНІКАЎ ЮРФАКА ● У ДАПАМОГУ КАМСАМОЛЬСКАМУ АКТЫВІСТУ ● БДУ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ ● ЗАПРАШАЕ МІЖВУЗАЎСКІ ПРАФІЛАКТОРЫЙ ● ВУЧЭБНАЯ ПРАКТЫКА: ЗАВОЧНІКІ ГЕАФАКА НА СТАНЦЫІ «ЗАХОДНЯЯ БЕРАЗІНА» ● ПЯЦЬ ГАДОЎ У МІНСКУ ● АБ ЧЫМ ПІШУЦЬ ШМАТТЫРАЖКІ ВНУ КРАІНЫ ● СТАРОНКІ КАЛЕНДАРА: ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. ЭЙНШТЭЙНА

НАВУКОВАЕ ЖЫЦЦЁ

## БДУ — народнай гаспадарцы

Падведзены вынікі конкурсу 1978 года на лепшую пастаноўку і арганізацыю работ па ўкараненню дасягненняў універсітэцкай навукі ў народную гаспадарку краіны, аб'яўленага рэктаратам, парткомам і мясцкомам універсітэта ў адказ на пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне і перавыкананне плана 1978 года і ўзмацненне барацьбы за павышэнне эфектыўнасці і якасці работы».

У конкурсе прымалі ўдзел галіновыя навукова-даследчыя лабараторыі і кафедры, выконваючыя гасдагаворныя навукова-даследчыя работы. Правядзенне конкурсу дазволіла з поспехам рэалізаваць план укаранення вынікаў завершаных навукова-даследчых работ у народную гаспадарку краіны, перавыканаць заданне па атрыманню фактычнага эканамічнага эфекту.

ПЕРШАЕ МЕСЦА ў спаборніцтве кафедр упэўнена заняла кафедра ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі (загадчык прафесар С. С. Шушкевіч). У народную гаспадарку краіны ўкаранёны вынікі 5 навукова-даследчых работ, выкананых на кафедры. Гадавы эканамічны эфект ад іх выкарыстання склаў 837,3 тыс. руб.

Кафедра радыёфізікі ЗВЧ (загадчык прафесар У. В. Ізох), якая вызначаецца высокімі паказчыкамі сувязі даследаванняў з вучэбным працэсам, укараніла ў вытворчасць вынікі трох навукова-даследчых работ з эканамічным эфектам 328 тыс. руб. і заняла ДРУГОЕ МЕСЦА.

Рэалізацыя рэкамендацый сацыёлагаў кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў (загадчык кафедры прафесар Г. П. Давідзюк, загадчык сектара прыкладной сацыялогіі С. А. Шавель) на трох буйных прадпрыемствах БССР з эканамічным эфектам 506 тыс. руб. дазволіла заняць кафедры ТРЭЦЯЕ МЕСЦА.

У конкурсе галіновых навукова-даследчых лабараторый ПЕРШАЕ МЕСЦА заняла галіновая навукова-даследчая лабараторыя сродкаў і метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі (загадчык лабараторыі дацэнт І. Р. Гулакоў), шэраг распрацовак якой укаранёны ў 1978 годзе з эканамічным эфектам 250 тыс. руб.

Вялікі аб'ём работ, звязаных з арганізацыяй серыйнага выпуску прылады для вызначэння тэмпературы ўспышкі нафтапрадуктаў, быў праведзен ГНДЛ тэрмадынамікі нафтахімічных працэсаў (загадчык лабараторыі дацэнт А. Д. Пешчанка). Лабараторыя заняла ДРУГОЕ МЕСЦА.

Кафедра ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі і ГНДЛ сродкаў і метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі ўзнагароджаны вымпеламі «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва», кафедры радыёфізікі ЗВЧ, марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў і ГНДЛ тэрмадынамікі нафтахімічных працэсаў узнагароджаны Граматамі рэктарата, парткома і мясцкома.

**Г. БАРАНАЎ,**
кіраўнік службы
ўкаранення НДР БДУ.

**Сучаснае жыццё патрабуе ад кожнага чалавека шырокіх ведаў. Вышэйшая адукацыя зараз стала не толькі даступнай, але і неабходнай справай для юнакоў і дзяўчат. Многія з іх паступаюць у ВНУ адразу ж пасля школы, некаторыя — папрацаваўшы на прадпрыемстве або ў калгасе — прыходзяць на падрыхтоўчае аддзяленне.**

**Ніна Балдышэўская прыехала ў Мінск з Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці, дзе працавала ў паляводчай брыгадзе. Марай дзяўчыны было паступіць вучыцца на журналіста. Актыўны ўдзел у «Камсамольскім пражэктары», у раённай газеце дапамагаў Ніне наблізіцца да сваёй мэты.**

**Зараз Ніна Балдышэўская — слухач падрыхтоўчага аддзялення БДУ. Вучоба, грамадская работа прыносяць ёй задавальненне.**

Фота **А. Дабрыяна.**



## На злёце выдатнікаў

Звыш ста выдатнікаў вучобы юрыдычнага факультэта сабраліся на злёт, каб падвесці вынікі сваёй працы, вызначыць задачы на будучае.

З дакладам выступіў дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар Васіль Фёдаравіч Чыгір. Ён паведаміў, што факультэт заняў першае месца сярод факультэтаў універсітэта па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі. Далей Васіль Фёдаравіч сказаў:

— Да спецыялістаў, якіх мы рыхтуем на нашым факультэце, прад'яўлены вялікія патрабаванні. Ужо той факт, што нашы выпускнікі паспяхова працуюць не толькі ў нізавых звеннях дзяржаўнай сістэмы, а і ў розных міністэрствах: юстыцыі, сельскай гаспадаркі і іншых, — гаворыць сам за сябе. Таму мы павінны перш за ўсё клапаціцца аб якасці вучобы.

Больш таго, перад факультэтам паўстае задача рыхтаваць спецыялістаў з вучонай ступенню і званнем, што абумоўлена патрэбамі ў высокакваліфікаваных кадрах вышэйшых навучальных устаноў і г. д. Для гэтага ёсць усе ўмовы: і добрая матэрыяльная база, і вопытныя выкладчыцкія кадры. Усё астатняе залежыць ад сур'ёзнасці і адказнасці, з якімі студэнты адносяцца да сваёй галоўнай задачы — вучобы. Але паспяховае выкананне гэтай задачы заключаецца не толькі ў індывідуальнай вучобе кожнага студэнта. Калектыў, яго дзейсны ўплыў — вось што павінна адыграць значную ролю ў вучэбных поспехах усіх студэнтаў...

А потым выступалі самі выдатнікі, камсоргі.

Жана Жарына, студэнтка III курса, цікава расказала аб рабоце і задачах савета выдатнікаў факультэта, старшынёй якога яна з'яўляецца. Валянціна Пацярута, выдатніца II курса, адзначыла ў сваім выступленні, што правільныя суадносіны вучобы з грамадскімі абавязкамі могуць прынесці кожнаму студэнту вялікую карысць.

Сакратар партыйнай арганізацыі А. А. Шынгель уручыў лепшым выдатнікам і актывістам граматы. Намеснік старшыні вучэбна-вытворчай камісіі Віктар Луцыін уручыў каштоўныя падарункі. Акрамя гэтага, 15 выдатнікаў былі прэміраваны паездкай у горад Вільнюс.

Ва ўрачыстай абстаноўцы быў зачытан «Зварот злёту выдатнікаў да ўсіх студэнтаў факультэта», які заклікаў палепшыць ідэйна-выхаваўчую работу на факультэце, дабіцца 100-працэнтнага наведвання заняткаў студэнтамі, павысіць якасныя паказчыкі экзаменацыйных адзнак, дасягнуць таго, каб у кожнага было грамадскае даручэнне і г. д.

«Зварот выдатнікаў злёту» з'явіўся своеасаблівай праграмай студэнтаў юрфака на другі семестр.

**А. ФІЛІМАНЮК,**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**




## Кнігі камсамольскаму актывісту

«Партыя разглядае моладзь як стваральную, творчую сілу ў барацьбе савецкага народа за камунізм»—гэтыя словы з Праграмы КПСС служаць эпіграфам да кніжнай выстаўкі «У дапамогу камсамольскаму актывісту», якую падрыхтавалі зараз супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі. Яе адкрываюць кнігі У. І. Леніна і Л. І. Брэжнева, зборнік «Ленін і моладзь» і кніга В. С. Філінава «У партыйным кіраўніцтве сіла камсамола».

Выстаўка складаецца з аддзелаў «Табе запальваць полымя» і «Аб справах камсамольскіх», якія прадстаўлены кнігамі і артыкуламі з часопісаў па адпаведнай тэматыцы.

Пачынаючых камсоргаў, членаў камсамольскіх бюро курсаў і факультэтаў, безумоўна, зацікавяць такія выданні, як «Спадарожнік камсамольскага актывіста», «Школа камсамольскага актывіста», «Школа камсамольскага важака», «У дапамогу камсамольскаму прапагандысту».

Асобна вызначаецца серыя «Бібліятэка камсамольскага актывіста», у якую ўваходзяць «Інфармацыя ў камітэтах камсамола» В. Сушчэвіча, «Камсамольскае даручэнне» Г. Роўкіна, «Камітэт камсамола — калектыўны арганізатар» І. Смірнова, зборнікі «Студэнцкая група», «Групкамсорг», «Камсамол у ВНУ».

Увагу прыцягваюць і зборнік «Важакі камсамола» з серыі «Жыццё выдатных людзей», і кніга Л. Г. Максімава «Запявалы цікавых спраў», і «Нечарназем'е—адрас камсамольскага подзвігу» Ф. П. Кіяшкі, і іншыя кнігі—дарадчыкі і памочнікі ў камсамольскіх справах.

**Т. САХАШЧЫК.**

* * *

Нядаўна ў БДУ імя У. І. Леніна адбылася вучоба актывістаў маладзёжнага руху Польскай Народнай Рэспублікі. Тры тыдні дваццаць пяць чалавек—актывістаў з вышэйшых навучальных устаноў ПНР разам з камсамольскімі работнікамі БДУ абмяркоўвалі важныя пытанні паўсядзённай работы студэнцкага актыву, абменьваліся вопытам. За час вучобы адбылося двое практычных заняткаў, на якіх ішла размова аб акадэмічнай і навуковай рабоце, якая праводзіцца камітэтам камсамола універсітэта, аб Ленінскім заліку як комплекснай праграме грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў. З дакладамі аб сістэме грамадска-палітычнай практыкі ў пазавучэбны час, ФГП і ШМЛ, аб методыцы правядзення дыспутаў, тэматычных абмеркаванняў перад гасцямі выступалі М. Прыгодзіч, В. Андруховіч, Н. Шуніна, У. Карагін, І. Велічанскі, Г. Ільяшчук і іншыя камсамольскія работнікі БДУ.

Польская моладзь азнаёмілася з прынцыпамі афармлення наглядцай агітацыі, прапагандай маладзёжнага друку, арганізацыяй падпіскі на яго.

**І. САВЕТКІНА.**

Знаёмцеся: нашы сябры

# ПЯЦЬ ГАДОЎ У МІНСКУ

СТУДЭНТКА з Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Нго Ань Тует вучыцца на V курсе факультэта прыкладной матэматыкі. Чаму іменна на ФПМ?

Адказаць на гэта пытанне двума словамі, што «прафесія падабаецца», раўназначна таму, што амаль нічога не сказаць, калі выбар жыццёвага шляху для яе не толькі асабістае жаданне, а і грамадскі абавязак.

Інтэнсіўнае развіццё народнай гаспадаркі СРВ патрабуе больш шырокага выкарыстання высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія добра валодаюць сучаснымі метадамі навуковага кіраўніцтва эканомікай. А ў Мінску — як адзначаюць многія в'етнамскія студэнты—падрыхтоўка такіх спецыялістаў вядзецца добра.

Без трывалых ведаў нельга стаць добрым спецыялістам. Без ведаў таксама немагчымы ніякі карысны творчы пошук.

...Іменна ў гэтым рэчышчы і праходзіла наша размова з Нго Ань Тует. І тое, аб чым гаварыла в'етнамская студэнтка, былі не проста прыгожыя, разумныя словы. У сказаным ёю адчувалася асабістае меркаванне. Больш — перакананне, якое дзяўчына ўпэўнена сцвярджае сваёй паспяховай вучобай. Напрыклад, за IV курс Нго Ань Тует мела толькі адну адзнаку «добра», усе ж астатнія экзамены яна вытрымала на выдатна.

Цяпер у пяцікурснікаў вытворчая практыка. Цікава, ці зрабіла які-небудзь уплыў на характар дзяўчыны яе канкрэтнае дачыненне да вытворчасці? Сапраўды, падобнае адчулі многія... Не, іх сяброўка не вельмі змянілася, але ж уласцівыя ёй характэрныя рысы «ажылі» на вытворчасці з большай маштабнасцю. А вось што кажа сама Нго Ань Тует: «Я шмат думала аб тым, як буду працаваць. Зразумела, пытанне стаяла не ў сэнсе добра ці дрэнна... Якія якасці неабходны добраму спецыялісту? Якія якасці неабходны мне, каб быць добрым спецыялістам? — вось што мяне хвалявала. І зараз таксама хвалюе...».

Атрымліваючы веды, Нго Ань Тует ужо меркавала, дзе і як іх будзе выкарыстоўваць... Яе своеасаблівая «практычнасць» яскрава сведчыць аб вялікай адказнасці, з якой в'етнамская студэнтка рыхтуе сябе да будучай працоўнай дзейнасці.

Сярод маіх пытанняў было і такое: «А ці часта прыходзяць пісьмы з дому? І колькі часу не была на Радзіме?».

— Пяць гадоў я там не была, —адказала Нго Ань Тует. — І вельмі, вельмі сумую. Праўда, цяпер засталося да той жаданай хвіліны, калі я ступлю на родную зямлю, ужо нямнога часу. А пісьмы прыходзяць кожны тыдзень... Толькі вось з пачатку вайны яшчэ не было. Што там? Мае бацькі жывуць у Ханоі, і хоць верыцца, што кітайскія захопнікі туды не дойдуць, але ўсё роўна вельмі хвалююся... Не толькі за сваіх родных, за ўвесь наш в'етнамскі народ.

— Звычайна, — працягвае Нго Ань Тует, — бацька ў пісьмах папярэджвае, каб добра вучылася, старалася. А мама больш за ўсё клапоціцца аб маім здароўі. Па іх пісьмах я добра разумею, што адбываецца ў нашай краіне.

Наша шматпакутная радзіма зноў змагаецца. Гераічна і самаахвярна. Змагаецца для таго, каб мы, сённяшнія студэнты, вярнуўшыся ў В'етнам, змаглі свае веды і сілы шырока выкарыстоўваць для пабудовы новага жыцця.

Нашай краіне патрэбны высокаадукаваныя спецыялісты. Мы, в'етнамскія студэнты, гэта добра разумеем і таму шчыра імкнёмся атрымаць трывалыя веды.

Савецкія студэнты шмат дапамагаюць нам у вучобе, імкнуцца зрабіць наша жыццё ў Мінску цікавым і светлым. Я ад усяго сэрца выказваю ім за гэта вялікую падзяку».

В. ЧУЧМАН.

Другі семестр навучальнага года — найбольш адказная пара студэнцкага жыцця. Гэта перавадны і выпускны семестр. Для таго, каб паспяхова здаць экзамены і залікі летняй экзаменацыйнай сесіі, каб пазбегнуць непатрэбнага хвалявання і штурмаўшчыны, трэба сур'ёзна вучыцца на працягу ўсяго семестра. Добра разумеюць гэта чацвёртакурснікі хімічнага факультэта, якіх вы бачыце на здымках у час лабараторных заняткаў.

Фота **М. Дубовіка.**







# ЗАПРАШАЕ МІЖВУЗАЎСКІ ПРАФІЛАКТОРЫЙ

На беразе Заслаўскага вадасховішча ў маляўнічым месцы размясціўся буйнейшы ў краіне студэнцкі прафілакторый-санаторый. Каля 350 студэнтаў з інстытутаў і тэхнікумаў беларускай сталіцы штомесячна маюць магчымасць падлячыцца і адпачыць там, набрацца сіл.

Кожны месяц 76 студэнтаў нашага універсітэта знаходзяцца на лячэнні ў прафілакторыі. Прафком БДУ размяркоўвае пуцёўкі паміж факультэтамі, а прафбюро кожнага факультэта — паміж студэнтамі. У першую чаргу пуцёўкамі забяспечваюцца студэнты, перанёсшыя хваробы, і тыя, хто мае хранічныя захворванні.

Вядома, што лягчэй папярэдзіць хваробу, чым яе лячыць. У гэтым дапамагаюць фізічная культура і спорт. Канькі і лыжы зімой, лодкі і катэры летам прапаноўвае жыхарам прафілакторыя спортбаза. Да іх паслуг таксама валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі, настольныя гульні. Часта праходзяць тут спартыўныя спаборніцтвы.

За 24 дні адпачынку удзельнікі чарговага заезду паспяваюць пасябраваць, нават стварыць свой, асабісты калектыў, выявіць таленты. Колькі вынаходлівасці і ініцыятывы праяўляюць студэнты ў правядзенні вечароў, сустрэч, спартыўных мерапрыемстваў. У распараджэнні студэнтаў — кіназала. Для аматараў кнігі — прасторныя чытальныя залы і холы.

Вялікая ўвага ўдзяляецца нагляднай агітацыі. Амаль усе стэнды зроблены рукамі студэнтаў.

Але ўсё ж галоўнае ў прафілакторыі — гэта ўвага да здароўя адпачываючых. 15 лячэбных кабінетаў, абсталяваных навейшай медыцынскай апаратурай, абслугоўваюць студэнтаў. Кіруе прафілакторыем - санаторыем галоўны ўрач Уладзімір Сідаравіч Пасечкін.

Па цвёрдаму распарадку пад'ём тут — у 6-30, адбой — у 23 гадзіны. На заняткі студэнтаў возяць аўтобусы.

— Ці хапае ў вас часу на падрыхтоўку да заняткаў? — пытаюся ў студэнткі IV курса філфака Ліліі Саўчук. І яна расказвае, як спалучаюць студэнты падрыхтоўку да заняткаў з лячэннем і адпачынкам, як цікава і карысна праводзяць час у прафілакторыі.

А. АЎРУСЕВІЧ.
(Прэс-цэнтр прафкома).

ВУЧЭБНАЯ ПРАКТЫКА

# Ёсць такая навука

СА СЛОВАМ «прырода» мы звыкла звязваем свой адпачынак на ўзлеску ці побач з маляўнічай рэчкай. Зусім іншы сэнс яно набыло для студэнтаў-географаў з кафедры геалогіі і глебазнаўства. «Прырода для нас не толькі аб'ект назірання, гэта і разнастайныя даследаванні, і пошук эфектыўнага выкарыстання яе багаццяў у народнай гаспадарцы», — гавораць яны. Выказванне, як бачым, не новае, але і не выпадковае, глебазнаўства як навука ў нашы дні набывае ўсё большае значэнне. Ёй належыць будучыня ў распрацоўцы прадукцыйнасці глебы. Адзначаны і кірунак да мэты. Ён ляжыць праз вывучэнне практычна важных асаблівасцей і ўласцівасцей глебы ў асобных раёнах.

Для будучых географаў такім асобным раёнам стала геабаза «Заходняя Беразіна». Штогод прыязджаюць сюды на вучэбную практыку і студэнты-завочнікі. З тым, як праходзіць іх практыка, нас знаёміць дацэнт У. У. Стацко.

— Мне не першы год даводзіцца быць кіраўніком практыкі ад кафедры геалогіі і глебазнаўства. Прыемна заўважыць стаўшую ўласцівай такую рысу ў студэнтаў-завочнікаў, як сур'ёзныя адносіны да справы, удумлівасць. Калі параўноўваць тэрміны з намечаным аб'ёмам практыкі, міжволі прыходзіш да вываду: мала часу адведзена на палявую практыку глебазнаўцам. За чатыры дні неабходна ахапіць амаль такое ж кола пытанняў, над якім студэнты дзённага аддзялення працуюць каля трох тыдняў. За чатырохдзённы тэрмін глебазнаўцам неабходна навучыцца ўмела выбіраць месца для закладкі шурфаў, правільна іх апісаць: замалёўваць на паперы, вылучыць глебава-генетычныя гарызонты, правесці апрабаванне глебы на карбанатнасць і закісныя формы жалеза, набыць навык самастойнага вывучэння і карціравання глебы на мясцовасці і г. д., усяго каля дзесятка пунктаў.

Вядома, што за такі кароткі тэрмін нельга грунтоўна авалодаць гэтымі навыкамі. А зрабіць практыку больш працяглай не дазваляе вучэбны план.

**— Уладзімір Уладзіміравіч, што яшчэ адметнае можна сказаць аб практыцы завочніка?**

— Перад практыкай завочнікам вычытваецца не поўнасцю курс, а толькі пэўная частка. Пазней, пасля практыкі, абапіраючыся на палявыя работы, курс вычытваецца да канца. Сабраныя студэнтамі матэрыялы выкарыстоўваюцца для лабараторных работ. Такая методыка дазваляе кожнаму студэнту пасля практыкі выбраць кафедру, якая яго больш за ўсё цікавіць.

**— Мясціны Заходняй Беразіны багатыя флорай і фаунай. У гэтым плане географам пашанцавала. А што вы скажаце аб умовах жыцця і працы і ці створаны яны для студэнтаў на перыяд практыкі?**

— Геабаза «Заходняя Беразіна» ўяўляе сабой невялікі гарадок. Дарэчы, будавалі яго самі студэнты. Ёсць тут тры інтэрнаты, якія адразу могуць уладкаваць каля 300 чалавек, сталовая на 200 месц, тры жылыя будынкі для выкладчыкаў. У абсталяваных лабараторыях можна праводзіць неабходныя аналізы.

Але нельга не сказаць і аб недахопах, якія перашкаджаюць паспяховаму правядзенню практыкі. І ў гэтым годзе па-ранейшаму застаецца нявырашаным пытанне аб харчаванні. Сняданак, абед і вячэру студэнты будуць зноў рыхтаваць самі. А прадукты давядзецца завозіць з Мінска, бо замацавацца за нейкай харчовай кропкай на месцы пакуль немагчыма.

Няма ў нас, глебазнаўцаў, свайго палігона з гатовымі шурфамі, якія можна было б скарыстоўваць на працягу некалькіх год. Таму нам даводзіцца кожны раз капаць новыя шурфы і пасля заканчэння практыкі абавязкова іх закапваць.

Інтэрв'ю правеў **М. КУРГАНСКІ.**

# ЦІКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ

Кожны год факультэт журналістыкі дае пуцёўку ў жыццё сваім студэнтам. Па добрай даўняй традыцыі студэнты запрашаюць да сябе ў госці вядомых журналістаў, пісьменнікаў, дзеячаў навукі і культуры.

Нядаўна тут адбылася сустрэча студэнтаў факультэта з маладымі журналістамі рэспублікі, удзельнікамі рэспубліканскага семінара маладых журналістаў. З прывітальным словам да ўдзельнікаў сустрэчы звярнуўся дэкан факультэта, прафесар Р. В. Булацкі. Ён расказаў аб тых зменах, якія адбыліся і адбываюцца ў вучэбнай праграме, у тэхнічных сродках навучання ў святле «Пастановы аб мерах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». Потым перад студэнтамі выступілі маладыя журналісты, якія падзяліліся вопытам сваёй работы, сваіх першых крокаў у журналістыцы.

Цікавым і змястоўным было выступленне Ж. Залознай, выпускніцы факультэта, зараз супрацоўніцы галоўнай рэдакцыі радыёвяшчання для моладзі. Яна расказала аб тым, як ствараліся такія цыклы перадач, як «Аперацыя «Мінута», «Зямля клопатаў нашых», аб героях гэтых перадач.

Затым выступіў В. Царэнка, рэдактар аддзела прапаганды Гомельскага тэлебачання. Ён сканцэнтраваў увагу студэнтаў і гасцей на тэхнічным баку падрыхтоўкі журналістаў, расказаў аб сваіх першых кроках у тэлежурналістыцы.

Пра творчы пошук, пра яго ролю ў раённай газеце расказала загадчык аддзела чашніцкай раённай газеты «Чырвоны прамень» Г. Ігнаценкава. Вопытам работы ў заводскай газеце падзяліўся супрацоўнік шматтыражкі «Інтэграл» вытворчага аб'яднання «Інтэграл» А. Прастата. Ён звярнуў увагу на пытанне эканамічнай падрыхтоўкі журналістаў, унёс прапанову шырэй разглядаць задачы прэсы ў сацыялістычным спаборніцтве.

Пасля сустрэчы маладыя журналісты і групы студэнтаў наведалі Дом літаратара, дзе перад імі выступілі І. Шамякін, Б. Сачанка, І. Чыгрынаў, В. Быкаў, Д. Семановіч, Я. Янішчыц, кампазітары І. Лучанок, В. Іваноў, спявачка С. Кульба. Яны расказалі аб шляхах развіцця літаратуры, музыкі, далі маладым журналістам парады наконт далейшых, цесных сувязей літаратуры, музыкі і друку.

А. КОЗЕЛ.





**На здымках:** з цікавымі прапановамі звярнуўся да выкладчыкаў і студэнтаў журфака былы выпускнік факультэта А. Прастата.

Фота **В. Маскалёва.**

## СТАРОНКІ КАЛЕНДАРА

**14 САКАВІКА — 100 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АЛЬБЕРТА ЭЙНШТЭЙНА (1879—1955).**

Імя творцы тэорыі адноснасці і аднаго са стваральнікаў квантавай тэорыі бессмяротна, як імёны Галілея, Каперніка, Ньютана. У. І. Ленін пісаў аб Эйнштэйне як аб вялікім пераўтваральніку прыроды. Ідэі Эйнштэйна змянілі панаваўшыя ў фізіцы з часоў Ньютана механістычныя погляды на прастору, час і прывялі да новай матэрыялістычнай карціны свету, якая заснавана на глыбокай арганічнай сувязі гэтых паняццяў з матэрыяй і яе рухам.

Аб Эйнштэйне і яго працах напісана каля пяці тысяч кніг. Ён сцвярджаў: «У мяне няма ніякага таленту, а толькі страсная зацікаўленасць».

Яго лічылі тупым дзіцем. «З вас, Эйнштэйн, ніколі нічога путнага не выйдзе», — сказаў яму настаўнік гімназіі ў Мюнхене. Прафесар фізікі ў федэральным вышэйшым палітэхнічным вучылішчы ў Цюрыхе гаварыў, што ў яго дастаткова прылежнасці і добрай волі, але не хапае здольнасцей. Ніхто рашуча не бачыў у ім генія, не ведаў аб гіганцкай працы, якая бесперапынна здзяйснялася ў ягоным мозге. А ён не хаваў яе. «Што датычыцца навукі, — пісаў сябру 23-гадовы Эйнштэйн, — то мне прыйшло ў галаву некалькі цудоўных ідэй, але яны яшчэ патрабуюць грунтоўнай дапрацоўкі».

Праз тры гады нарадзілася яго юнацкая праца — прыватная тэорыя адноснасці. Рукапіс — каля трыццаці друкаваных аркушаў — ён напісаў за пяць тыдняў.

Вялікі вучоны-гуманіст успрыняў з самага пачатку Кастрычніцкую рэвалюцыю як сусветна гістарычную падзею. З жывым удзелам сачыў за пабудовай сацыялізму ў Савецкай краіне. Эйнштэйн рашуча выступаў у абарону правоў чалавека, супраць фашызму, войнаў, прымянення ядзернай зброі.

Працы Эйнштэйна неаднаразова выходзілі ў нас у краіне. Аб жыцці і асобе вучонага напісана нямала кніг.

100-годдзю з дня нараджэння стваральніка тэорыі адноснасці прысвячаецца зборнік артыкулаў буйнейшых вучоных «Альберт Эйнштэйн і тэорыя гравітацыі», які выпускае выдавецтва «Мір».

# У ВНУ КРАІНЫ



**«Кишиневский университет»**

## ФОРУМ РАМАНІСТАЎ

У пачатку 1979 года каля горада Балагое Калінінскай вобласці праходзіла IV Усесаюзная канферэнцыя па раманскаму мовазнаўству па тэме «Сучасныя праблемы раманістыкі (семантычны аспект вывучэння раманскіх моў)». Канферэнцыя, арганізаваная сектарам раманскіх моў інстытута мовазнаўства АН СССР і кафедрай французскай філалогіі Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта, сабрала 210 удзельнікаў, прадстаўнікоў 46 гарадоў 8 саюзных рэспублік, аўтараў 185 надрукаваных тэзісаў, гасцей. Удзельнікі канферэнцыі, сярод якіх 2 члены-карэспандэнты АН СССР, 20 дактароў навук і 70 кандыдатаў навук, абмеркавалі актуальныя пытанні раманістыкі. Семантычны аспект вывучэння раманскіх моў разглядаўся на ўзроўнях марфемы, слова, словазлучэння, сказа і звышфразавага адзінства ў планах лексічнай і граматычнай марфалогіі, сінтаксіса, стылістыкі, агульнай семантыкі, семіётыкі, сацыялінгвістыкі, лінгвагеаграфіі, інжынернай лінгвістыкі і тэорыі камунікацыі. Не засталіся без увагі і пытанні металогіі і метаду лінгвістычнага аналізу.

В. БАНАРУ,
кандыдат філалагічных навук.

**«Ленинградский университет»**

## КАШТОЎНАЯ НАВУКОВАЯ ПРАЦА

Вучоны савет Ленінградскага універсітэта прысудзіў штогадовыя універсітэцкія прэміі за лепшыя навуковыя работы 1978 года.

Першую універсітэцкую прэмію атрымаў прафесар біёлага-глебазнаўчага факультэта Б. В. Громаў за кнігу «Мікраарганізмы — паразіты водарасцей», прысвечаную вывучэнню паразітаў аднаклетачных водарасцей. Аднаклетачныя водарасці з'яўляюцца асноўнай часткай фітапланктона Сусветнага акіяна і прэсных вод і складаюць істотную частку біямасы ўсёй біясферы.

Кніга Б. В. Громава адкрывае ў навуцы зусім новы і істотны раздзел — паталогію аднаклетачных водарасцей — альгапаталогію.

Манаграфія прафесара Б. В. Громава — першая ў свеце, прысвечаная гэтай праблеме, а яе аўтар з'яўляецца тварцом новага і важнейшага напрамку ў фітапаталогіі. Хоць кніга Б. В. Громава — першая ў свеце зводка па паразітах аднаклетачных водарасцей, значную яе частку складаюць яго ўласныя матэрыялы, атрыманыя ў эксперыментальных даследаваннях і пры назіраннях з дапамогай светавога і электроннага мікраскопаў. Манаграфія Б. В. Громава ўяўляе сабой каштоўную арыгінальную навуковую працу, канцэнтрат звестак з сусветнай літаратуры па праблеме паразітавання мікраарганізмаў на водарасцях.

**«Бауманец»**

## ВУЧАЦЦА КАНТРАЛЁРЫ

У сферы дзейнасці камісіі грамадскага кантролю пры прафкоме МВТВ імя Баумана розныя мерапрыемствы: правядзенне кантрольных закупак, арганізацыя кантрольных аналізаў, пастаянная ўвага да санітарнага стану буфетаў і сталовых. Каб стаць членам КГК, неабходна атрымаць некаторыя навыкі. Напрыклад, неабходна ведаць правіла правядзення кантрольных закупак. Састаў камісіі непастаянны, таму што кожны год прыходзяць новыя студэнты, для якіх штогод праводзіцца вучоба актыву камісіі грамадскага кантролю.

Кандыдатуры членаў факультэцкіх КГК прапаноўваюцца актывам груп. Паступіўшыя праходзяць трохмесячны выпрабавальны тэрмін. Пасля гэтага яны атрымліваюць часовыя пасведчанні на шэсць месяцаў. Гэта садзейнічае таму, што ў камісіі застаюцца толькі тыя, хто цвёрда вырашыў займацца нялёгкай грамадскай работай. І да яе ўдзельнікі камісіі адносяцца сур'ёзна.

На чарговых занятках КГК прысутнічалі прадстаўнікі санэпідэмстанцыі Бауманскага раёна і Аддзела па барацьбе з крадзяжом сацыялістычнай маёмасці. Яны расказалі, як правільна праводзіць кантрольныя закупкі, як паводзіць сябе ў розных канфліктных сітуацыях.

На сходзе выступіў старшыня КГК пры прафкоме МВТВ В. Блізнец. Ён растлумачыў асноўныя абавязкі членаў КГК. А затым для «навабранцаў» камісіі грамадскага кантролю была праведзена паказальная кантрольная закупка.

**«Мордовский университет»**

## ДРУЖБА

20—21 лютага ў Мардоўскім універсітэце прайшла навукова-метадычная канферэнцыя «Акадэмічная група — асноўнае звяно ў фарміраванні ўсебакова развітой асобы савецкага спецыяліста».

* *

Добрыя сувязі склаліся паміж Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. В. Ламаносава і Мардоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М. П. Агарова.

Гэта сяброўства ўходзіць сваімі каранямі к шэфству буйнейшага універсітэта краіны над сваім малодшым братам. Мардоўскі універсітэт у самы цяжкі для сябе час — у перыяд станаўлення атрымаў вялікую дапамогу ад МДУ імя М. В. Ламаносава. Зараз, калі гісторыя сяброўства налічвае звыш 20 гадоў, цяжка пераацаніць важнасць уплыву МДУ на рост навуковага патэнцыялу Мардовіі.

Шматлікія вучоныя Мардовіі прайшлі аспірантуру ў Маскве, у МДУ імя М. В. Ламаносава, і ў цяперашні час з'яўляюцца вядучымі спецыялістамі нашай ВНУ.

С. Д. ВАРФАЛАМЕЕЎ.

**«За советскую науку»**

## ГАРЫЗОНТЫ СТУДЭНЦКАЙ НАВУКІ

З кожным годам у Растоўскім універсітэце павялічваецца колькасць студэнтаў, якія займаюцца навукова-даследчай работай. У 1978 годзе ўсімі формамі НДРС былі ахоплены 4.321 чалавек (а ўсяго на дзённым аддзяленні займаецца 5.611 студэнтаў).

Шырокае развіццё атрымала такая форма арганізацыі НДРС, як праблемная група. Створана «Палажэнне аб праблемнай групе», дзе замацаван статус яе як аб'яднання, рашаючага актуальную навуковую праблему метадам калектыўнай творчасці. Зараз у РДУ 115 такіх аб'яднанняў.

Але для таго, каб будучы спецыяліст на справе праявіў свае сілы і здольнасці, дзейнічае і такая форма уцягнення ў НДРС, як работа па гасдагаворах. У мінулым годзе ў выкананні гасдагаворнай тэматыкі ўдзельнічала 452 студэнты, у той час як у 1977 годзе—363.

Аб прагрэсе, дасягнутым у вобласці студэнцкай навукі, гаворыць і той факт, што студэнтамі ці ў сааўтарстве з імі было надрукавана 73 работы, пададзена 5 патэнтных заявак, атрымана 1 аўтарскае пасведчанне. А 102 студэнцкія даследаванні рэкамендаваны да ўкаранення ў народную гаспадарку.

Развіццё НДРС адбілася на павелічэнні колькасці работ, прадстаўленых на розныя конкурсы, канферэнцыі, выстаўкі.

А. КУТАЕВА.

На конкурс

# УМЕННЕ БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ

**Тут амаль ніколі не бывае бязлюдна. У ціхім, утульным пакоі за адным сталом старшыня прафбюро рыхтуецца да чарговага пасяджэння, за другім — праформі рыхтуюць выступленні. А побач вырашаецца пытанне аб уплаце членскіх узносаў.**

**Гэта звычайны малюнак будзённага працоўнага дня прафбюро біялагічнага факультэта, які па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за снежань быў адным з лепшых па прафсаюзнай рабоце сярод факультэтаў універсітэта. Справы прафсаюзныя — састаўная частка спаборніцтва, прысвечанага 60-годдзю БССР і КПБ. Штодзень узнікаюць новыя планы, новыя пытанні. А інакш і быць не можа, бо такі загад нашага часу. Толькі што каля дзвярэй прафбюро чулася бесперапынная гаворка. Але раптам усё сціхла. Пачалося пасяджэнне. Тут рашаюцца вельмі важныя пытанні студэнцкай работы, падводзяцца вынікі работы прафсаюзных арганізацый за мінулы вучэбны семестр.**

**Аб сваёй рабоце паведамляе праформ трэцяй групы III курса Л. Міхейчык. (Патрэбна адзначыць, што яе арганізацыя па выкананню планаў прафсаюзнай работы займае I месца). Вядома, тут у нейкай ступені заслуга і старшыні.**

**— Ларыса самы актыўны член прафбюро нашага факультэта, — адзначае ў гутарцы старшыня В. Шачанок. — З усім запалам сэрца, з поўнай аддачай сваіх сіл спраўляецца яна з даручанай справай. Рэгулярна ў групе праводзяцца прафсаюзныя сходы, пасяджэнні прафбюро групы. Пытанні, якія вырашаюцца на іх, вызначаюцца сваёй актуальнасцю і важнасцю. Вось і на гэты раз... Штомесячна прыходзіцца Ларысе забяспечваць студэнтаў льготнымі праязнымі білетамі, своечасова збіраць членскія ўзносы. Ва ўсіх гэтых клапатлівых справах на дапамогу прыходзіць старшыня прафбюро В. Шачанок. Добрыя, разумныя яго парады пры вырашэнні цяжкасцей, непаразуменняў падбадзёрваюць, надаюць баявы настрой.**

**Работа, якая праводзіцца пад кіраўніцтвам Л. Міхейчык, шырока асвятляецца ў насценнай газеце. I сапраўды, ёсць аб чым пісаць! Работа прафарганізацыі бачна ва ўсім. Зараз прафарганізацыя Ларысы, як і ўсе астатнія, рыхтуецца да агляду мастацкай самадзейнасці. Амаль штодзённа праходзяць рэпетыцыі харавога і танцавальнага гурткоў. Шмат выдатных танцораў і спевакоў ёсць у групе.**

**Студэнты трэцяй групы прымаюць актыўны ўдзел у спартыўным жыцці факультэта. Сярод іх У. Ціток, Г. Саладуха. I сама Ларыса таксама любіць спорт. Асабліва захапляецца лёгкай атлетыкай, баскетболам. Зараз яна займаецца ў валейбольнай секцыі. Здавалася б, нямала часу прыходзіцца траціць на вучобу, на грамадскія справы, але знаходзіцца час і на адпачынак. Любіць яна пачытаць мастацкую літаратуру, заняцца рукадзеллем. А хіба не прыемна з сябрамі ў выхадны дзень схадзіць у кіно, тэатр, на вечар адпачынку або ў цырк! На ўсё хапае часу, калі адносіцца да яго беражліва.**

**Л. СЕРЫК,**
**студэнтка I курса журфака.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

## МЫ—ШЭФЫ

АЎТОБУС нёсся ўперад. У салоне было весела і шумна. Агітбрыгада БДУ імя У. І. Леніна ехала з чарговым канцэртам у свой падшэфны Уздзенскі раён.

У жыцці раёна адбылася важная падзея: яму ўручаны ганаровы Чырвоны сцяг ЦК КПБ, ЦК ЛКСМБ, Беларуската рэспубліканскага савета прафесіянальных саюзаў за дасягнутыя поспехі ў ажыццяўленні рашэнняў XXV з'езда КПСС.

## ЯШЧЭ АДЗІН КАНЦЭРТ

Група — з 20 чалавек. Усе з розных факультэтаў. Але шмат разоў былі яны ў сумесных паездках, таму і ведаюць адзін аднаго ўжо добра.

Канцэрты агітбрыгады заўсёды сустракаюцца цёпла і добразычліва. Доўга гучаць апладысменты.

Так было і на гэты раз. Гучалі песні, не сціхалі вершы, імкліва несліся ў залу рытмы танцавальных мелодый.

Шмат апладысментаў атрымалі ўдзельнікі вакальнага квартэта гістарычнага факультэта: І. Піўчанка, Н. Кузьміч, І. Міхайлава і Е. Сівалобава.

Доўга не адпускалі гледачы дуэт з механіка-матэматычнага факультэта Т. Куско і А. Бельцкага. Глыбока усхвалявала прысутных выступленне студэнта IV курса філалагічнага факультэта Л. Еранькова. Ціха скацілася сляза у аднаго з ветэранаў, заблішчэлі вочы ў другога... Напэўна, кожны з іх успамінаў сваё, асабліва з палымяных ваенных дзён. Леанід выканаў пад гітару песню «Малююць хлопчыкі вайну».

У канцэрце прынялі ўдзел дуэт сясцёр з ФПМ (Таццяна і Галіна Шавейкі), П. Фрынкель — студэнт хімфака, лаўрэат агляду на лепшае выкананне палітычнай песні.

У той вечар гучалі пранікнёныя радкі вершаў А. Вазнясенскага ў выкананні А. Мятліцкага. Канцэрт быў арганізаван прафкомам універсітэта. Вялі яго А. Мятліцкі і Н. Табашкава.

**М. ЛАХВІЧ,**
**(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).**

ЧАЛАВЕК І ЗАКОН

## СПРАВА КОЖНАГА

ГРАМАДСКІ парадак — гэта устаноўлены дзяржаўны парадак паводзін людзей у грамадскіх месцах, на вуліцах, плошчах, у парках, на стадыёнах, у час вулічных шэсцяў, дэманстрацый. Забеспячэнне і ахова грамадскага парадку ў краіне з'яўляецца непасрэдным абавязкам органаў унутраных спраў. Але барацьба з парушэннямі грамадскага парадку і са злачынствам немагчыма без актыўнай дапамогі працоўных. Яна праяўляецца ў розных формах: пазаштатнае супрацоўніцтва з міліцыяй, грамадскія саветы пры дзіцячых пакоях (вядуць барацьбу з безнагляднасцю дзяцей), грамадскія аўтаінспектары і іншыя. Адной са спецыяльных, арганізаваных форм удзелу грамадскасці ў ахове парадку з'яўляюцца добраахвотныя народныя дружыны. Асновы арганізацыі і дзейнасці ДНД былі юрыдычна аформлены ў 1959 годзе сумеснай пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб удзеле працоўных у ахове грамадскіх парадкаў у краіне». У саюзных рэспубліках былі прыняты палажэнні аб дружынах. У нашай рэспубліцы зараз дзейнічае «Палажэнне аб добраахвотных народных дружынах па ахове грамадскага парадку», зацверджанае пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР 3 ліпеня 1974 года. Згодна з гэтай пастановай, дружыны закліканы забяспечваць грамадскі парадак, праводзіць актыўную выхаваўчую і растлумачальную работу з працоўнымі, змагацца з хуліганствам, п'янствам, тунеядствам.

Пры выкананні абавязкаў дружыннік павінен насіць нарукаўную павязку, мець пры сабе пасведчанне, нагрудны знак дружынніка. Дружыннікі маюць права патрабаваць ад грамадзян спынення парушэнняў грамадскага парадку, пры неабходнасці правяраць дакументы, пацвярджаючыя асобу, затрымліваць парушальніка не больш чым на гадзіну і дастаўляць у міліцыю, штабы народных дружын. Дружыннік мае права заходзіць у клубы, на стадыёны, у кінатэатры для спынення правапарушэнняў, для праследавання парушальнікаў, якія скрываюцца.

Пры выкананні абавязкаў па ахове грамадскага парадку дружыннікі карыстаюцца правам бясплатнага праезду на гарадскім пасажырскім транспарце (за выключэннем таксі) па спецыяльных праязных білетах, якія выдаюцца на тэрмін дзяжурства.

Дружыны ствараюцца на прадпрыемствах, ва ўстановах, у домакіраўніцтвах, калгасах і саўгасах. У нашым універсітэце у радах дружыны налічваецца больш тысячы студэнтаў і супрацоўнікаў. Яны дзяжураць у пэўных раёнах, замацаваных за кожным факультэтам. Рэйды звычайна праводзяцца два разы ў месяц.

**І. ВІРЫНСКАЯ,**
**студэнтка юрфака.**



Рытм жыцця. Фота М. Дубовіка.

ПА БДУ

ІНФАРМАЦЫЯ

Даўняя дружба звязвае студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна і супрацоўнікаў інстытута фізікі АН БССР. Нядаўна ў інстытуце адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці студэнтаў універсітэта, у якім прыняло ўдзел трыо палітычнай песні (А. Зайцава, А. Бялова, А. Седзякоў). У іх выкананні прагучалі песні, напісаныя А. Зайцавай. Выступіў вакальны квартэт гістфака, гучалі вершы ў выкананні ўдзельнікаў студыі мастацкага слова.

Канцэрт быў цёпла сустрэт.

М. МІХАЙЛАЎ.

З гумарам аб этыкеце

## ПРЫВІТАННЕ



Чалавек сустрэў чалавека. Як па-рознаму адзначаюць людзі гэту падзею! Яны ці абменьваюцца поціскам рук, ці адвешваюць зямныя паклоны, або прыціскаюць руку да лба і да сэрца, абдымаюцца, стукаюць адзін аднаго па спіне, цягаюць за вушы, труцца насамі і нават... высоўваюць язык. Але што б яны ні рабілі і што б яны ні гаварылі ў час сустрэчы («Дзень добры», або «Мір вам!», ці «Я цябе бачу»), не адказаць на прывітанне або ўхіліцца ад яго ва ўсе часы і ва ўсіх народаў значыла ці поўнае зневажэнне чалавека, ці крайнюю ступень нявыхаванасці.

Аднак іншае прывітанне крыўдзіць не менш, чым яго адсутнасць. Мы разумеем, што такія рытуалы складаных паклонаў не для нашага часу. Але ніякія тэмпы дваццатага стагоддзя не апраўдваюць лахматага юнака, які з цыгарэтай у зубах і рукамі ў карманах кідае хмурае «Здрасце!» сваёй былой настаўніцы.

Што ж датычыцца праблемы «Хто першы?», абмеркаванне якой звычайна выліваецца ў галаваломкі тыпу: «А калі начальнік жанчына, але маладая, а мужчына — падначалены, але стары і прыйшоў з жонкай...» — мы яе абмяркоўваць не будзем. Могуць быць розныя правілы. Але, дзейнічаючы па прынцыпу «Першым вітаецца той, хто лепш выхаван», можна быць гарантаваным ад памылак.

- Прислушивайся к людям, даже если ты плохо слышишь.
- Отрицая свои ошибки, непогрешимым все равно не станешь.
- Если плохие привычки у тебя в крови — сделай переливание крови.
- Хочешь, чтобы тебе было весело? Посмотри на себя со стороны.
- Будь оргиналом: не повторяй старых ошибок.
- Иногда чувство меры вытесняет другие чувства.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 429. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 03727